# “Калісь глядзеў на сонца я...”

## ГАЛЕРЭЯ ПАРТРЭТНЫХ ВОБРАЗАЎ ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА



***Уладзімір Кожух.* Сямейны партрэт.**

1981 г. Палатно, алей.

*Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

## РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ

ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

# “МАДОННА” І “МАДОННЫ”

## ГЕЛІЯГРАВЮРА БАГДАНОВІЧАЎ



**Гравюра “Сіксцінская мадонна”** (КП 005991). *Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

“Мадонны” – раздзел зборніка “Вянок” Максіма Багдановіча. Паводле першапачатковай задумы, ён быў прысвечаны канкрэтнай асобе, але фактычна злучыў у сабе ўсе жаночыя вобразы, якія хвалявалі паэта. Імя абранніцы Максім не раскрыў: «*На рэдакцыю “Нашай нівы” пасылаю паэмку “У вёсцы”, першую з аддзела “Мадонны”, гэты аддзел прысвячаю А. Р. К. (так толькі буквы і пастаўце)*», але мы ведаем, што за ініцыяламі, якія так і не былі пастаўлены, хаваецца імя паэтавай каханай *Ганны Рафаілаўны Какуевай*.

Адносіны з Ганнай угадваюцца ў яшчэ адной паэме раздзела – “Вераніка”, а вось назва, хутчэй за ўсё, адсылае да іншага знаёмства. У біяграфічных звестках пра М. Багдановіча імя *Вераніка* трапляецца аднойчы – гэта маленькая пляменніца яго аднакласніка *Вераніка Залатарова*. Атрымліваецца своеасаблівы рэверсіўны рух, калі ў паэме “У вёсцы” Максім бачыць сталыя рысы паводзінаў у маленькай дзяўчынкі, а ў аўтабіяграфічнай паэме ў назве “дарослай” гісторыі кахання стаіць імя маленькай прыяцелькі.

Узбагачае, ускладняе вобраз яшчэ адна няспраўджаная задума. Згодна з урыўкам з ліста В. Ластоўскага ад 24 кастрычніка 1913 г., у раздзел павінна была ўвайсці нізка “Каханне і смерць”. Верагодна, да яе напісання паэта падштурхнулі ўспаміны дзяцінства. Максім ведаў, што неўзабаве пасля нараджэння дачкі Ніны памерла яго маці, а праз колькі гадоў – яго маладая мачыха Аляксандра загінула пасля родаў.

І толькі тут мы падыходзім да артэфакта, які ілюструе наш аповед. Размова пра геліягравюру, надрукаваную Францам Ганфштэнглем у Мюнхене ў XIX ст. на аснове “Сіксцінскай мадонны” Рафаэля Санці. Гравюра – адзін з падарункаў, які Адам Багдановіч і Аляксандра Волжына атрымалі на вяселле ад М. Горкага. Былі таксама рэпрадукцыі з карцін “Ранак стралецкага пакарання” В. Сурыкава, “Хрыстос у пустэльні” і “Партрэт Дастаеўскага” В. Сярова, “Тры волаты” В. Васняцова.

Аляксандра, як і мама, адбілася ў свядомасці М. Багдановіча сапраўднай гераіняй – сышла ў іншы свет, даўшы жыццё новаму чалавеку. Адметнасцю нізкі “Каханне і смерць” стала доля натуралістычнасці і фізіялагічнасці. Таварышы М. Багдановіча згадвалі, што ён меў акушэрскія веды і мог бы прыняць роды.

Рускамоўны празаічны эцюд “Мадонна” надрукаваны ў 1913 г. у газеце “Голас”. Ён дае магчымасць праз маналог лірычнага героя больш аб'ёмна разгледзець тэму жанчыны. З невялікім мастацтвазнаўчым аналізам, згадкай пра Дрэздэн, дзе захоўваецца шэдэўр Рафаэля, празаічным пераказам гісторыі васьмігадовай “мадонны”, якая суцешыла маленькага хлопчыка, выхадам на вышэйшую прыгажосць вобраза жанчыны-маці.

Геліягравюра падарожнічала з Багдановічамі ад кватэры да кватэры, заўсёды была навідавоку – аздабляла кабінет бацькі і праз ненавязлівую прысутнасць у жыцці Максіма спрычынілася да з'яўлення раздзела “Мадонны” і эцюда “Мадонна”. Дзіўным чынам яна перажыла пажар 1918 г., які знішчыў амаль усю маёмасць сям'і. Выява зберагалася ў нашчадкаў Багдановічаў і ўрэшце праз Ірыну Паўлаўну Папову трапіла ў музей. Каб сведчыць наведвальнікам залы “Мадонны”:

*О, як прыгожы-дзіўны ты,*
*Двайной красы аблік ядыны!*
*Ажыў у ім твой вечны цэль,*
*Мадонн тварыцель, Рафаэль!*

**Міхась БАРАНОЎСКІ,**
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.